# "Тры сястры"

Так назвалі сваю выстаўку ў мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" тры маладыя мастачкі — нядаўнія выпускніцы Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Вольга Бычко (у дзявоцтве Піскун), Софія і Валянціна Піскун. Вольга скончыла аддзяленне жывапісу, Софія — графікі, а Валянціна — касцюма і тэкстылю. Гэтых маладых жанчын звязвае адно дзяцінства, якое праходзіла ў творчай атмасферы, паколькі іх бацькі — вядомыя далёка за межамі Беларусі жывапісцы і мастакі па касцюмах — Юрый Піскун і Алена Юр'ева-Піскун. Яны адна за адной вучыліся і з поспехам скончылі гімназію-каледж мастацтваў імя І.В.Ахрэмчыка, дзе кожная з іх, так бы мовіць, набыла свой непаўторны голас. Потым — Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, удзел у мастацкіх выстаўках, пленэрах... Нягледзячы на тое, што творчыя шляхі ў мастачак падобныя, іх погляды на свет, што люструюцца ў вобразах, вельмі непадобныя.

Карціны Вольгі Бычко запрашаюць цябе ў прыгожы, рамантычны свет. Фарбы адначасова і яркія, і пяшчотныя, яны заварожваюць, палоняць цябе, і ты трапляеш у дзівосны, казачны свет, свет дзяцінства, дзе ёсць час прыслухацца да "Шуму мора", можна патрымаць у руках матылька ("Крылы вясны"), дакрануцца да "Жар-птушкі", сустрэць у "Саване" рагатую жывёлу з амаль чалавечым поглядам. Сярод яе герояў шмат дзяцей — хлопчыкі, дзяўчаты, і кожны са сваім характарам і сваёй марай...

Работы Валянціны Піскун рэзка адрозніваюцца ад папярэдніх. Яны больш сучасныя, вострыя. І ў яе творах, нават у нацюрмортах, таксама шмат непаўторнай казачнасці ("Імбрык", "Бык" і інш.). Тут жа побач можна ўбачыць сцэнічныя строі, якія створаны на аснове народных. Валянціна Піскун працуе мастаком у нашым слынным ансамблі "Харошкі".

А вось творы Софіі Піскун уражваюць сваёй маштабнасцю. Мастачка працуе ў розных тэхніках графікі (асабліва цікавыя яе афорты — тэхніка станковай графікі глыбокага друку, якая дазваляе атрымліваць з дапамогай кіслаты адбіткі з гравюры) і жывапісу. У графічных аркушах і жывапісных палотнах Софіі Піскун шмат алегорый, філасофскіх абагульненняў. Кожную яе работу можна вельмі доўга разглядаць, дзівіцца з таго, як дакладна прамалявана кожная дэталь. У яе таксама ёсць казачныя сюжэты ("Карабель-зніч", "Гензэль і Грэтэль"), а ёсць творы-прыпавесці ("Чаша Венецыі", "Горад-клетка", "Структура"). І, бадай, самыя загадкавыя — гэта творы, прысвечаныя евангелістам...

Як жа цікава паглядзець на такіх родных па крыві і такіх розных у сваёй творчасці людзей!

**Васіліна САКАЛОЎСКАЯ.**



В.Бычко. "Тры сястры".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ